Міхась ДАНІЛЕНКА

# Шчасце так не даецца...

Яшчэ як толькі падыходзіў да дома, дзе жыў, Кавалёў зразумеў: прыехала дачка. У двары, каля пад'езда, стаяла "Мазда". Некалі, калі Кавалёў толькі рыхтаваўся да абароны дысертацыі, дапамог грашыма набыць гэту машыну.

— Гарык няблага зарабляе, — тлумачыла Ніна. — Ды нешта не заладзіўся ў апошні час у яго бізнес. Дапамажы: хутка добрыя грошы будзеш закалачваць.

— А ты ведаеш, колькі закалочваюць кандыдаты навук?

— Ну, такія ж грошы, як мой Гарык.

Зяця звалі Гаўрыла. Ніна пасвойму перайначыла: клікала Гарыкам, хоць ведала, што гэта не падабаецца бацьку. (Мусіць, і мужу таксама.)

Дачка сядзела ў цяньку ад каштана: ключоў ад бацькавай кватэры ў яе не было.

— Дзе гэта ходзіш так доўга? — паднялася яна насустрач. — Можа, дзе пазнаёміўся з якой жанчынкай. Пара б...

Кавалёў нахмурыўся: не любіў, што Ніна так хутка забылася на нябожчыцу-маці. Але прамаўчаў. Ведаў, зараз Ніна будзе скардзіцца на свайго Гарыка ці прасіць грошай.

Так яно і атрымалася. Дачка паднялася і, як толькі яны ступілі ў кабіну ліфта, загаварыла:

— Не ладзіцца ў мяне з Гарыкам. Нейкі чужы ён, тата.

— А калі яго выбірала, дык не быў чужы?

— Ну, што ты ўсё заводзішся... Шчасця ў мяне няма.

Гарык быў другім у Ніны. З першым — спакойным і разважлівым Паўлам — дачка пражыла ўсяго паўгода. Не сышліся характарамі, казала. Павел з'ехаў адразу ў Расію. І як ведаў Кавалёў з нінчыных намёкаў, усталяваўся там надоўга. Зрэшты, гэта асабліва не хвалявала дачку. З'ехаў, ну і бог з ім...

У кватэры Ніна правяла наманікюранымі пальчыкамі па падаконніку. Пылу не было, і яна падышла да кніжнай паліцы.

— А гэта тыя часопісы, дзе твае мудрыя артыкулы друкавалі? — паказала яна на тыя, што стаялі побач з кніжкамі ў пераплётах.

— Табе не ўсё роўна? — зазлаваў Кавалёў. — Ты хіба цікавілася калі, што напісана ў тых часопісах?

— Не было калі. Хапала клопату без іх. Вунь мой Гарык хацеў запрэгчы мяне ў сваім офісе. Знайшоў служанку, — грэбліва фыркнула яна.

Ніна ўселася на канапе. "Зараз пачне прасіць грошай" — падумаў Кавалёў. Аднак памыліўся: дачка часта заміргала вейкамі і дастала хусцінку з сумачкі.

— Няма, тата, у мяне шчасця. Няма, — заплакала яна. — Мы з Гарыкам сталі ў апошні час як быццам чужымі.

— А ці было яно калі ў цябе, тое шчасце? — раззлаваўся Кавалёў. — Ці паварушыла ты пальцам, каб здабыць яго?

Дачка здзіўлена падняла вочы. На твары яна размазала касметыку і здзіўлена глядзела на бацьку. Амаль ніколі не бачыла яго такім узрушаным.

А Кавалёў хадзіў па пакоі і ўслых успамінаў, як яны некалі з нябожчыцай-маці неслі яе, немаўля, і былі бясконца шчаслівымі. Расказаў Ніне, як спявалі яны пад добры настрой удвух — хоць галасы не надта мілагучныя былі. А ў іх усё атрымлівалася. І было так светла ў іхніх душах, і такімі шчаслівымі былі абое...

Ніна застыла на канапе з хусцінкай у руцэ: не магла зразумець, як можна быць шчаслівым, калі тая неабароненая дысертацыя вунь пыліцца ў шафе, а бацьку хоць бы што.

Кавалёў сапраўды не шкадаваў, што марна патрачана было столькі часу. Разваліўся Саюз. У новых умовах праз колькі гадоў ён здзіўлена чытаў у адной з газет артыкул незнаёмага яму аўтара. Падпісана кандыдатам філасофскіх навук. Мусіць, былі і такія спрытнюгі, як амаль і заўсёды ў жыцці.

— Не перажывай, — параіў ён дачцэ. — Вяртайся да свайго Гаўрылы. Ды пачынай усё па-новаму. З чыстага ліста. Перачытай вунь той дэвіз, што на маёй паліцы. Ты нават і не заўважыла. І ўголас Кавалёў паўтарыў радкі паэта:

*Шчасце так не прадаецца,*
*І яго не купіць.*
*Шчасце сеецца, жнецца,*
*Шчасце ў кузнях куецца,*
*У мартэнах кіпіць.*

Пасля яны спускаліся з Нінай у ліфце. Затым ён праводзіў засмучаным позіркам "Мазду", якая знікала за паваротам. І ведаў: не зразумела яго дачка. Жывуць яны — як, між іншым, і многія цяпер — у зусім розных вымярэннях...